**А.І.Сцепанцоў,**
*прарэктар Беларускага інстытута праблем культуры*

# КАДРЫ – ТВОРЦЫ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Кадры культуры – асноўны дзейсны кампанент мастацкай культуры. Яны ажыццяўляюць важнейшую функцыю культуры — вытворчасць яе каштоўнасцей, іх зберажэнне, назапашванне і перадачу. Сувязь пакаленняў, далучэнне дзяцей і моладзі да культурных традыцый, забеспячэнне культурных патрэбнасцей і зносін людзей, мастацкая творчасць – асноўныя сферы дзейнасці спецыялістаў у галіне культуры.

Менавіта кадравы склад культуры вызначае яе змест, статусную характарыстыку. Кадры культуры – аб'яднанне людзей спецыфічных спецыяльнасцей: акцёраў, музыкантаў, мастакоў, кіраўнікоў мастацкіх калектываў, выкладчыкаў школ мастацтваў, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных устаноў, бібліятэкараў, кіраўнікоў і работнікаў упраўленняў і аддзелаў культуры, а таксама навучэнцаў, студэнтаў, аспірантаў і дактарантаў сферы культуры.

Кадры культуры ў цэлым могуць быць ахарактарызаваны як устойлівая, дзейсная, разгалінаваная сістэма, здольная самастойна задавальняць асноўныя мастацка-культурныя запатрабаванні грамадства і эстэтычныя патрэбнасці людзей: навучанне мастацтву дзяцей, падлеткаў і моладзі; прафесійная мастацкая адукацыя; забеспячэнне патрэб прафесійных і самадзейных мастацкіх калектываў у выканаўцах і кіраўніках; падрыхтоўка, перападрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі кадраў культуры; фарміраванне прафесарска-выкладчыцкага корпусу; міждзяржаўныя мастацкія сувязі Беларусі і інш. Аб гэтым сведчаць поспехі маладых прадстаўнікоў Беларусі на міжнародных мастацкіх конкурсах, дасягненні нацыянальных школ балета, жывапісу, тэатра, актыўная творчая дзейнасць многіх вядомых майстроў беларускай культуры, у тым ліку народных артыстаў і мастакоў.

Спецыфіка дзейнасці спецыяліста культуры выяўляецца ў скіраванасці на асаблівы аб'ект – мастацкую творчасць. Ї нават больш – гэта не проста скіраванасць, а светаадчуванне, светапогляд, асаблівае жыццё (душэўнае, эмацыянальнае) у мастацтве.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Справядлівым выглядае ўжо звыклы выраз"якія кадры, такая і культура" Сапраўды, здольнасці, кваліфікацыя, актыўнасць спецыяліста ў многім вызначаюць стан і ўзровень функцыянавання ўстановы культуры, мастацкага калектыву.

Сёння ў рэспубліцы ёсць 35 431 штатная пасада спецыялістаў і кіраўнікоў сферы культуры. Запоўнена з іх 33 794 месцы. Вакансій — 1 637 (4,6%).

Вышэйшую адукацыю маюць 11 068 (31,2%) работнікаў, сярэднюю спецыяльную — 17 213 (48,6). Пенсіённага ўзросту дасягнулі 1 910 чалавек (6%).

Назіраюцца пэўныя пазітыўныя працэсы ў кадравай палітыцы, накіраванай на паляпшэнне якаснага складу спецыялістаў галіны. Так, напрыклад, нягледзячы на скарачэнне клубных устаноў, колькасць спецыялістаў павялічылася з 8188 чалавек у 1990 г. да 9758 у 1999 г. Вырасла колькасць спецыялістаў з прафесійнай падрыхтоўкай з 53,8% у 1990 г. да 59% у 1999 г.

Наяўнасць вакансій абумоўлена шэрагам прычын. Гэта нізкая заработная плата работнікаў культуры і мастацтва, жыллёвыя і іншыя сацыяльныя праблемы, дэфіцыт прафесіяналаў па некаторых накірунках (харэографы, бібліятэкары, рэжысёры і дырыжоры), нізкі ўзровень маральнай і матэрыяльнай матывацый да абранай прафесіі ў выпускнікоў.

У выніку слабай матывацыі работы маладых спецыялістаў, а таксама па іншых прычынах многія выпускнікі не з'яўляюцца па накіраванні на працу або датэрмінова пакідаюць яе, асабліва ў вёсцы. Напрыклад, у 1998 г. не з'явіліся па размеркаванні выпускнікі ССНУ: у Брэсцкай вобласці — 48%; Віцебскай — 34; Гродзенскай — 43,7; у Магілёўскай — 10%.

Адной з актыўных формаў пераадолення негатыўных тэндэнцый з'яўляецца пашырэнне мэтавай і кантрактнай сістэм набору, якое зараз ажыццяўляецца.

На Беларусі створана сістэма адукацыі ў галіне культуры, якая добра сябе зарэкамендавала. Яна ўключае 526 школ мастацтваў, 21 сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову, 3 вышэйшыя навучальныя ўстановы, адзін галіновы інстытут і ў асноўным забяспечвае краіну спецыялістамі культуры.

У вышэйшых навучальных установах Міністэрства культуры навучаецца 4650 студэнтаў, з іх каля 14% — за ўласныя сродкі. Штогод з адрывам і без адрыву ад вытворчасці атрымоўваюць вышэйшую адукацыю каля 800 спецыялістаў. Падрыхтоўка (у тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліку мэтавая, для вёскі) вядзецца па 34 спецыяльнасцях. У навучальным працэсе прымаюць удзел 860 выкладчыкаў, з іх 565 — на поўнай стаўцы, 95 — на няпоўнай, 200 — па сумяшчальніцтве; дактароў навук — 16, кандыдатаў — 156, дацэнтаў — 194, прафесараў — 46.

На працягу апошніх трох гадоў захоўваецца ўстойлівая цікавасць моладзі да атрымання вышэйшай адукацыі ў ВНУ мастацтваў. Першынство тут утрымлівае Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры: конкурсы дасягалі сямі чалавек на месца. Высокія конкурсы былі на спецыяльнасць "акцёрскае мастацтва" ў Беларускую акадэмію мастацтваў – да дзесяці чалавек на месца. Своеасаблівы двухступеньчаты адбор у Беларускай акадэміі музыкі: лепшыя выпускнікі музычных вучылішчаў па выніках дзяржаўных экзаменаў рэкамендуюцца да паступлення ў акадэмію. Конкурс тут у сярэднім трымаецца ў колькасці два чалавекі на месца.

Адной з прычын цікавасці моладзі з'яўляецца трансфармацыя ВНУ мастацтваў у буйныя цэнтры сучаснай адукацыі і творчасці. Асаблівыя змены адбыліся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, дзе з'явіліся новыя кваліфікацыі: сацыяльны работнік, менеджэр, сацыяльны педагог, культуролаг, рэжысёр народных абрадаў і свят, арганізатар сацыяльна-культурнай дзейнасці, выкладчык сусветнай і айчыннай мастацкай культуры, выкладчык выяўленчага мастацтва. Развіццё ўстановы падштурхоўвае існуючая вострая патрэбнасць у кадрах вышэйшай кваліфікацыі: маюць вышэйшую адукацыю толькі 14,5% работнікаў клубаў, 19% – музейных супрацоўнікаў, 37% – бібліятэкараў. Кіраўніцтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры разумее і імкнецца вырашаць праблему насычэння сацыякультурнай сферы прафесійна падрыхтаванымі кадрамі, якім давядзецца працаваць у спецыфічных умовах адкрытага мікрасацыяльнага асяроддзя. Гэта павінны быць спецыялісты па аказанні сацыяльнай дапамогі насельніцтву, арганізацыі рознабаковай яго дзейнасці ў сферы вольнага часу, вырашэнні выхаваўча-адукацыйных задач, карэкцыі паводзін і сацыяльнай рэабілітацыі асобных груп, пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы.

У сярэдніх спецыяльных навучальных установах навучаецца 6860 чалавек, з іх прыкладна 1% — за ўласныя сродкі. Штогод выпускаецца каля 1700 спецыялістаў. Усяго выкладчыкаў — 2277, з іх штатных — 1805, з вышэйшай адукацыяй — 1952, з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічнай — 1605. Падрыхтоўка вядзецца па 29 спецыяльнасцях, 11 з якіх былі ўведзены за апошнія гады. У 1998 г. пачата падрыхтоўка па эстрадна-цыркавым мастацтве.

Адзначаецца станоўчая тэндэнцыя да павелічэння кантынгенту ССНУ. За апошнія пяць гадоў штогадовы прырост навучэнцаў склаў у сярэднім 94 чалавекі і дасягнуў у 1999 г. 7054 чалавекі.

Аднак усё больш выяўляецца супярэчнасць паміж сутнасцю, зместам сярэдняй спецыяльнай адукацыі (пэўная незавершанасць, неабходнасць працягу ўдасканалення на вышэйшай ступені адукацыі), імкненнем саміх выпускнікоў да вышэйшай адукацыі і колькаснай абмежаванасцю ВНУ ў прыёме на навучанне: яны могуць прыняць толькі палову выпускнікоў ССНУ мастацтваў. Гэта значыць, што перад маладым спецыялістам востра становіцца пытанне атрымання вышэйшай адукацыі не па профілі. І яны вырашаюць яго: паступаць у педагагічныя ВНУ на філалагічны, гістарычны факультэты ці нават у непедагагічныя ВНУ. Актуальным з'яўляюцца павелічэнне прыёму на завочную форму навучання ў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, у Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, Беларускую акадэмію мастацтваў, асабліва па спецыяльнасцях "бібліятэказнаўства", "харэаграфія", "акцёрскае мастацтва", "народная творчасць", а таксама адкрыццё завочнага вышэйшага педагагічнага каледжа на базе Мінскага музычнага вучылішча імя М.І.Глінкі.

Ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі работнікаў культуры ў Беларускім інстытуце праблем культуры, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, абласных курсах у Брэсце, Гомелі, Гродне, Магілёве. У Віцебску яно ажыццяўляецца на базе АНМЦ і аблбібліятэкі. За апошнія пяць гадоў павышэнне кваліфікацыі прайшлі: у Беларускім інстытуце праблем культуры — 8403 кіраўнікі і спецыялісты; Беларускай акадэміі музыкі — 1174 выкладчыкі ССНУ, на абласных курсах — 8182 чалавекі. Сярод іх музыкантаў — 33 %; бібліятэкараў — 27 %, работнікаў народнай творчасці — 21 %, музеязнаўцаў — 10 %, бухгалтараў і эканамістаў — 5 %, тэатразнаўцаў — 4 %.

Перападрыхтоўку кадраў культуры з 1994 г. вядзе Беларускі інстытут праблем культуры па двух спецыяльнасцях: музеязнаўства, ландшафтна-паркавая архітэктура. Плануецца пачаць перападрыхтоўку харэографаў і кіраўнікоў фальклорных калектываў. Гэта дазволіць замацаваць кадры прафесіяналаў у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сельскай мясцовасці. За кошт сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва шэраг маладых рэжысёраў тэатраў накіраваны на стажыроўку за мяжу.

Кіруючыя кадры сферы культуры — важны аспект кадравай палітыкі Міністэрства культуры. Сёння сярэдні ўзрост кіраўнікоў рэспубліканскіх, абласных і раённых устаноў культуры складае 45 гадоў. Прычым 7% ад агульнай колькасці дасягнулі пенсіённага ўзросту, 10% не маюць вышэйшай адукацыі.

З улікам росту патрабаванняў да дзейнасці кіруючых кадраў, фарміравання кадравага рэзерву ў рэспубліцы дзейнічае шматузроўневая сістэма работы з кіруючымі кадрамі (рэспубліканскія, мясцовыя семінары, кароткатэрміновыя курсы перападрыхтоўкі, атэстацыя і інш.).

Прыведзеныя даныя паказваюць, што ў рэспубліцы існуе разгорнутая сістэма ўстаноў, якая задавальняе асноўныя патрэбнасці ў кадрах культуры. Колькасныя параметры вытрымліваюцца. Які ж стан спраў з якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў?

Лабараторыя сацыялагічных даследаванняў Беларускага інстытута праблем культуры (загадчыца лабараторыі І.Р.Голубева) ажыццявіла сацыялагічны аналіз праблем павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў культуры ў сучасных умовах.

Выяўлена незадаволенасць работнікаў культуры ўзроўнем прафесійнай падрыхтоўкі, адукацыйным патэнцыялам. Як не зусім задавальняючыя (74 %) ці зусім незадавальняючыя (26 %) названы наступныя параметры: штаты запоўнены, але ўзровень падрыхтоўкі некаторых спецыялістаў не адпавядае іх функцыянальным абавязкам, многія работнікі не выяўляюць патрэбнай ініцыятывы, частка спецыялістаў адстае ад патрабаванняў часу, слабы прыток свежых сіл, мала моладзі.

Работнікі культуры ўсіх катэгорый адчуваюць патрэбнасць у пастаянным папаўненні сваіх ведаў. Гэта ўдасканаленне раней атрыманых ведаў у навучальных установах, атрыманне новых ведаў у сувязі са змяненнем зместу і формаў практычнай дзейнасці.

Так, загадчыкі аддзелаў культуры вызначаюць наступныя прыярытэтныя для сябе веды:

— па эканамічных і юрыдычных пытаннях — 59,7 %;

— у галіне кіравання, арганізацыі дзейнасці і эканомікі ўстаноў культуры — 58,3 %;

— па методыцы і арганізацыі культурна-асветніцкай работы — 51,4 %;

— у галіне мастацтва і культуры — 44,4 %;

— па менеджменту — 43,1 %;

— па сацыялогіі кіравання — 31,9 %;

— па псіхалогіі і педагогіцы — 30,6 %.

Дырэктары Дамоў культуры, загадчыкі клубаў адчуваюць патрэбу ў ведах па такіх дысцыплінах (у парадку ўбывання значнасці):

— тэорыя і гісторыя культуры;

— этналогія і фалькларыстыка;

— педагогіка;

— клубная работа, арганізацыя клубнай справы ў галіне кіравання;

— у галіне развіцця культуры і культурнай палітыкі за мяжой.

Якія патрабаванні ставіць навучальная ўстанова да кваліфікацыі спецыяліста?

Вось кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста з Дзяржаўнага стандарта вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці Г 12.01.00 “бібліятэказнаўства і бібліяграфія”, распрацаванага Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры (агульныя патрабаванні): “Спецыяліст павінен мець высокі ўзровень гуманітарных, сацыяльных, агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў, якія дазваляюць паспяхова ажыццяўляць прафесійную дзейнасць пасля надання яму адпаведнай кваліфікацыі ці акадэмічнай ступені пры назапашванні практычных навыкаў у бібліятэчна-інфармацыйных установах і далейшую актыўную творчую дзейнасць”. Маючы фундаментальную навуковую і практычную падрыхтоўку, спецыяліст павінен умець самастойна прымаць прафесійныя рашэнні з улікам іх сацыяльных наступстваў, няспынна папаўняць свае веды, аналізаваць гістарычныя і сучасныя праблемы палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця грамадства, ведаць месца і ролю ў ім сваёй прафесійнай дзейнасці, праблемы і тэндэнцыі яе развіцця ў кантэксце сусветнай цывілізацыі.

Спецыяліст павінен валодаць дзяржаўнымі мовамі Беларусі, умець выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці адну з замежных моў, ведаць асновы сусветнай і айчыннай культуры, ажыццяўляць пастаянна прафесійнае, культурнае і фізічнае самаўдасканаленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Патрабаванні да ведаў і ўменняў па цыклах дысцыплін: спецыяліст абавязаны ўмець вызначаць змест навучання па педагогіцы і псіхалогіі (агульнай, узроставай); сусветнай і беларускай літаратуры; міфалогіі, фальклоры, этнаграфіі; сусветнай гісторыі; прыродазнаўстве і тэхніцы, матэматычных метадах у інфарматыцы; дакументазнаўстве і гісторыі кнігі, бібліятэказнаўстве; сацыяльных камунікацыях, інфармацыйным рынку, інфармацыйных тэхналогіях і сістэмах; асновах экалогіі: па спецыяльных дысцыплінах, дысцыплінах спецыялізацыі.

Уражвае толькі агульны пералік цыклаў дысцыплін, кожны з якіх мае вельмі насычаную праграму. Відавочна, колькасць прадметаў ужо дасягнула мяжы, магчымай для свядомага засваення. Безумоўна, такое напаўненне вучэбнага працэсу патрабуе значнай мабілізацыі ўсіх душэўных і псіхалагічных сіл маладога чалавека і значнага фізічнага здароўя. Што датычыцца здольнасцей, то будзем лічыць, што па выніках уступных экзаменаў паступілі самыя здольныя абітурыенты.

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры існуе выдатны вопыт распрацоўкі дзейснай мадэлі падрыхтоўкі спецыяліста культуры. Засталося распрацаваць яшчэ механізм адаптацыі спецыяліста ў канкрэтнай установе культуры, што палегчыць і паскорыць уваходжанне маладога чалавека ў практычнае жыццё, у сферу актыўнай прафесійнай дзейнасці.

Невялікія памеры артыкула далі магчымасць толькі бегла абазначыць некаторыя праблемы кадравай сітуацыі ў рэспубліцы, але відавочна, што асноўныя намаганні органаў дзяржаўнага кіравання павінны быць скіраваны на навучальныя ўстановы і сістэму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ